УДК 069.5:94

# Музейная экспазіцыя як інтэрпрэтацыйная мадэль гістарычнай рэчаіснасці

***Гаўрылава С. В.***
*Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік, Полацк*

*Артыкул прысвечаны разгляду асаблівасцей музейнай экспазіцыі на аснове яе здольнасці выступаць у якасці прасторава-часавай мадэлі гістарычнай рэчаіснасці. Мінулае існуе ў свядомасці людзей у выглядзе ўяўленняў пра яго, у сучаснасці мінулае прадстаўлена "асколкамі" – прадметамі, якія музей выяўляе, збірае, захоўвае і прэзентуе. Музейны прадмет, які з'яўляецца асновай экспазіцыі музея, у кантэксце дадзенага даследавання прыняты як згорнутая мадэль рэчаіснасці. Менавіта экспанаты ўтвараюць прадметна-прастораваю структуру экспазіцыі. Працэс інтэрпрэтацыі музейных прадметаў – гэта галоўны мадэлюючы механізм, які дэтэрмінуе напаўненне гэтай прасторы сэнсамі і фарміраванне яе часавай арганізацыі. Здольнасць прадметаў рэпрэзентаваць не толькі факты, з'явы і падзеі гісторыі, але і прадстаўляць цэлыя эпохі, робіць музейны час не аддзельным ад прасторы. Музейнае мадэляванне мае некалькі ўзроўняў і грунтуецца на музейнай інтэрпрэтацыі аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны. Пры розным спалучэнні тых ці іншых аспектаў як унутранага, так і знешняга інфармацыйнага поля прадметаў могуць быць атрыманы розныя, часам супрацьлеглыя мадэлі. Адэкватнае ўспрыняцце наведвальнікам прэзентаванай музеем мадэлі рэчаіснасці і генерыраванне ўласнай мадэлі залежыць ад шэрага аб'ектыўных і суб'ектыўных фактараў.*

*Праведзенае даследаванне дазволіла сфармуляваць аўтарскую дэфініцыю паняцця "музейная экспазіцыя".*

***Ключавыя словы:*** *музейны прадмет, музейная экспазіцыя, музейнае мадэляванне, гістарычная рэальнасць, інтэрпрэтацыя музейная.*

*(Искусство и культура. – 2019. – № 2(34). – С. 71–75)*

# Museum Exposition as an Interpretation Model of Historical Reality

***Haurylava S. V.***
*Polotsk National Historical and Cultural Museum-Reserve, Polotsk*

*The article considers the peculiarities of the museum exposition in terms of its ability to act as a spatio-temporal model of historical reality. In people's minds the past exists in the form of its representation; in the present the past is presented by the «fragments» – the objects that the museum uncovers, collects, preserves and presents. In the context of this study museum object, which is the foundation of the museum, is regarded as a concise model of reality. It is the exhibit that constitutes the subject-dimensional structure of the exposition. The process of interpretation of museum objects is the main modeling mechanism that determines the semantic content of this space and its temporal organization. The objects property to represent not only the facts, phenomena and events in history but whole epochs, makes the museum time inseparable from museum space. Museum modeling has several levels and is based on the museum's interpretation of historical and cultural heritage. When various combinations of different aspects of both internal and external information fields of the objects are taken into account, models obtained can be contradictory sometimes. Visitors' adequate perception of the model of reality presented by the museum and his or her self-generated model depends on a number of objective and subjective factors.*

*This study has allowed the author to formulate own definition of the concept of «museum exposition».*

***Key words:*** *museum object, museum exhibition, museum modeling, historical reality, museum interpretation.*

*(Art and Cultur. – 2019. – № 2(34). – P. 71–75)*

У сучаснай сацыякультурнай сітуацыі прагрэсіруючая апошнімі дзесяцігоддзямі тэндэнцыя рэгіяналізацыі надае асобае значэнне праблеме развіцця рэгіянальных музеяў. Мяняецца місія рэгіянальнага музея, заснаваная на ўмацаванні ў мясцовай супольнасці пачуцця прыналежнасці да канкрэтнай тэрыторыі, а таксама на фарміраванні станоўчага аблічча рэгіёну ў наведвальнікаў музеяў. Гэта не ў апошнюю чаргу звязана

*Адрес для корреспонденции: e-mail: soiskatel_2014@tut.by – С. В. Гаўрылава*

Репозиторий ВГУ



*Экспазіцыя Краязнаўчага музея.*
*Зала “Полацк у міжваенны перыяд 1917–1941 гг.”*



*Экспазіцыя Музея беларускага кнігадрукавання.*
*Зала “Францыск Скарына. Жыццё і дзейнасць”*

з прадстаўленнем цэласнай мадэлі развіцця рэгіёну ў экспазіцыі музея. У кантэксце азначанага асаблівае значэнне набывае экспазіцыя музея як асноўны канал камунікацыі паміж установай і грамадствам.

Рознасць падыходаў у даследаванні такога шматграннага аб’екта культуры, як музей, абумовіла разыходжанні ў вызначэнні паняцця экспазіцыі: яе разумеюць у якасці асноўнага канала камунікацыі ў тэорыі музейнай камунікацыі, як тэкст пры семіятычным падыходзе, як музейны прадукт у адпаведнасці з эканамічным падыходам, як твор мастацтва, як форму прэзентацыі гісторыка-культурнай спадчыны і г. д. Прадметна-прасторавыя і архітэктурна-мастацкія асаблівасці музейнай экспазіцыі былі прадметам даследаванняў А. І. Міхайлоўскай, Р. Р. Клікса, У. І. Рэвякіна, А. Я. Розэна, Я. А. Розэнблюма, Т. П. Палякова, І. В. Гарбунова і інш. Семантыка і семіётыка экспазіцыі музея разглядаліся ў работах З. А. Бонамі, Л. С. Іменавай, Т. П. Калугінай, М. В. Мазнага, В. С. Мішуроўскай і г. д. Праблема прасторава-часавай арганізацыі музейнай экспазіцыі сёння не разглядаецца комплексна. Асобныя артыкулы У. Ю. Дукельскага, А. Я. Кузьміной, У. У. Кандрацьева, А. А. Ніканавай, Г. К. Альшэўскай і інш. прысвечаны разгляду паняццяў “музейны час”, “музейны гістарызм”, “феномен музейнага мінулага”, “мадэляванне гісторыі”.

У сувязі з вышэйадзначаным падаецца актуальным разгляд паняццяў “мадэль”, “мадэляванне” ў прасторы музеялагічнага дыскурсу і на гэтай аснове фармуляванне дэфініцыі паняцця “музейная экспазіцыя”.

Мэта артыкула – аналіз уласцівасці музейнай экспазіцыі выступаць у якасці мадэлі гістарычнай рэчаіснасці, выяўленне яе структураўтвараючых фактараў і мадэлюючага механізма, у аснову якога пакладзены працэс інтэрпрэтацыі музейных прадметаў.

**Інтэрпрэтацыя музейных прадметаў як аснова музейнага мадэлявання рэчаіснасці.** Як было адзначана вышэй, музейная экспазіцыя – гэта асноўны канал музейнай камунікацыі, якая з’яўляецца часткай музейнай камунікацыйнай прасторы, дзе адбываецца мадэляванне культурнага дыскурсу, прэзентаванага музеем. У структуры камунікацыйнай прасторы музея выдзяляюцца “знешні” і “ўнутраны” ўзроўні камунікацыі. Першы ўзровень – знешні – фарміруюць камунікацыйныя працэсы, якія адбываюцца па-за межамі музея і інтэгруюць інфармацыйны патэнцыял музея ў сацыякультурную прастору рэгіёну. Другі – унутраны ўзровень – складаюць камунікацыйныя акты, што адбываюцца ў межах экспазіцыйнай прасторы музея. Культурны дыскурс разгортваецца «в рамках внутреннего коммуникационного пространства музея» «возле определенной образной *модели* (выдзяленне курсівам. – *С. Г.*) прошлого (реже – настоящего)» [1].

Мадэль (з фр. *modele,* лац. *modulus* – мера, узор, норма) у логіцы і метадалогіі навукі – аналаг (схема, структура, знакавая сістэма) вызначанага фрагмента прыроднай ці сацыяльнай рэчаіснасці – арыгінала мадэлі. Гэты аналаг служыць для захавання і пашырэння ведаў (інфармацыі) аб арыгінале, канструявання арыгінала, пераўтварэння ці кіравання ім. З гнасеалагічнага пункту погляду мадэль – гэта «прадстаўнік», «замяшчальнік» арыгінала ў пазнанні і практыцы [2].

Музейнае мадэляванне гістарычнай рэчаіснасці – гэта шматузроўневы працэс, які пачынаецца на стадыі камплектавання фондаў, калі вызначаецца каштоўнасць



Рэпазіторый ВДУ



*Экспазіцыя Мастацкай галерэі. Выстаўка “Сценапіс XII–XIX стагоддзяў Спаса-Праабражэнскай царквы XII стагоддзя Полацкага Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра”*



*Фрагмент экспазіцыі Музея гісторыі архітэктуры Сафійскага сабора*

выяўленага ў акаляючым асяроддзі аб’екта як крыніцы інфармацыі ў залежнасці ад абранага музеем падыходу. На другім узроўні мадэлявання адбываецца працэс тэзаўравання, калі раскрываецца інфармацыйны патэнцыял музейнага прадмета і яго месца ў аб’ектыўнай рэчаіснасці, у якой ён існаваў і выконваў свае ўтылітарныя функцыі. Трэці ўзровень – “фізічны” – утварае непасрэдна мадэляванне як працэс стварэння экспазіцыі музея. Апошні ўзровень – “камунікацыйны”, на якім адбываецца ўзаемадзеянне прэзентаванай музеем мадэлі рэчаіснасці і наведвальнікаў. Варта заўважыць яшчэ адзін аспект музейнага мадэлявання, які ў кантэксце дадзенага даследавання не разглядаецца. Само па сабе мадэляванне выступае як метад захавання музейных прадметаў, пры якім ствараюцца мадэлі матэрыяльных аб’ектаў. У гэтым сэнсе мадэль разглядаецца як спецыяльна створаны для экспанавання прадмет-замяшчальнік.

Першы і другі ўзроўні музейнага мадэлявання звязаны непасрэдна з аб’ектамі гісторыка-культурнай спадчыны і іх інтэрпрэтацыяй у кантэксце музейнага збору. Асновай любой музейнай экспазіцыі з’яўляецца музейны прадмет, які ў сваёй шматпланавасці здольны рэалізаваць адначасова некалькі функцый. Гэта навукова-інфармацыйная, камунікацыйная функцыі і функцыя мадэлявання рэчаіснасці. Кожны музейны прадмет уяўляе сабой «асколак» рэчаіснасці, якую немагчыма дакладна ўзнавіць, аднак неабходнасць яе пазнання вымагае стварэння яе мадэлі. З гэтага пункту погляду музейны прадмет з’яўляецца мадэллю гістарычнай рэчаіснасці, аднак сам па сабе, не ўтвараючы сэнсавых сувязяў з іншымі прадметамі, уяўляе згорнутую мадэль.

Напоўненасць інфармацыйнага поля экспазіцыі залежыць ад адной з самых істотных уласцівасцей музейнага прадмета – інфарматыўнасці, якая характарызуе «содержательную сторону музейного предмета, его способность выступать в качестве источника сведений об исторических событиях, культурных, общественных и природных явлениях и процессах» [3]. У музейным прадмеце заключана ў першую чаргу інфармацыя пра яго ўласцівасці і функцыі, другім планам выступае ўказанне на іншы змест, у кантэксце якога прадмет існаваў.

На трэцім узроўні, як і на папярэдніх, ажыццяўляецца інтэрпрэтацыя аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны, але ўжо ў кантэксце музейнай экспазіцыі. Самае агульнае вызначэнне інтэрпрэтацыі – тлумачэнне, трактоўка, раскрыццё сэнсу, вытлумачэнне любога факта, з’явы, падзеі. Канечным вынікам працэсу інтэрпрэтацыі з’яўляецца разуменне, такі стан свядомасці чалавека, калі з’ява, падзея ці факт упісваюцца ў яго ўласную карціну свету. Менавіта ў наданні сэнсу заключаецца якаснае адрозненне інтэрпрэтацыі ад іншых метадаў пазнання.

Адзін і той жа музейны прадмет можа служыць для пацвярджэння ці доказу розных, у тым ліку і супрацьлеглых фактаў. Прадмет уяўляе сабой цэльнасць формы і зместу, розныя аспекты якой актуалізуюцца ў працэсе інтэрпрэтацыі. Разгляд аб’екта ў кантэксце спарадзіўшай яго культуры дазваляе рэканструяваць цэласную рэчаіснасць, рэпрэзентаваную ім. Адной з праблем, звязаных з прадстаўленнем гэтай рэчаіснасці, з’яўляецца аднаўленне кантэксту ў музейнай прасторы. Асноўная ўласцівасць экспазіцыі заключаецца ў тым, што знакі яе аб’ектаў

Рэпазіторый БГУ

чытаюцца толькі ў кантэксце. Адэкватная інтэрпрэтацыя гісторыка-культурнай спадчыны, якая з'яўляецца адной з асноўных праблем сучаснай экспазіцыйнай дзейнасці, магчыма ў выніку вырашэння праблемы ўзаемасувязі гісторыі як рэальнасці і гісторыі як экспазіцыйнага аповеду пра яе. Для гэтага любы экспазіцыйны аповед падлягае кадзіраванню і рэпрэзентацыі, а яго значэнне выяўляецца ў ходзе інтэрпрэтацыі.

Вызначэнне зместу і характару музейнага матэрыялу – важнейшая, але не канечная задача музейнай дзейнасці. Вышэй за гэта стаіць духоўна-інтэлектуальная інтэрпрэтацыя, якая выяўляе сэнс і сутнасць як прадметнарэчавага свету, так і духоўнага, сацыяльнага, гістарычнага жыцця. Італьянскі філосаф, юрыст, тэолаг Э. Бэці пісаў: «На самом же деле то, что представляет для нас интерес в прошлом, мы не можем искать в самом прошлом: прошлого уже нет как актуальной данности, и нигде, ни в каком месте, мы не сможем поймать его именно в том виде, каким оно когда-то было. Мы должны искать прошлое там, где от него еще что-то сохранилось в настоящем, в том, что выжило в какой бы то ни было форме и в качестве формы доступно нашему нынешнему восприятию и опыту. Картина, рисующая прошлое, не может быть ничем иным, кроме как игрой фантазии, поскольку того, что могло бы быть изображено и воплощено в этой картине, более уже не существует: оно присутствует только в нашем представлении» [4].

Як правіла, у музейнай экспазіцыі выкарыстоўваецца не ўвесь інфармацыйны патэнцыял помніка. Неактуалізаваны пласт інфармацыі дае магчымасць убачыць так званыя незапланаваныя сувязі паміж аб'ектамі экспазіцыі, выявіць паралелі і сувязі, якія не прадугледжаны задумай экспазіцыянераў. Гэтая асаблівасць музейнага прадмета і дазваляе ствараць разнастайныя інтэрпрэтацыі.

**Музейная экспазіцыя як разгорнутая мадэль гістарычнай рэчаіснасці.** Музейная экспазіцыя ўяўляе сабой так званую візуальную інтэрпрэтацыю гістарычных падзей, з'яў, фактаў, якую ствараюць знакі, коды, увасобленыя ў матэрыяльных абалонках – музейных прадметах. Інфармацыйныя палі розных прадметаў перасякаюцца, утвараючы новыя сэнсы, што пераўтварае экспазіцыю музея ў разгорнутую мадэль рэчаіснасці.

Кампактнасць, узнаўляльнасць, зразумеласць, адраснасць – усе гэтыя ўласцівасці экспазіцыі як арганізаванага (на аснове навуковай канцэпцыі, якаснага адбору прадметаў і факталагічнага матэрыялу пасродкам глыбокай навукова-даследчай дзейнасці) набору кодаў праяўляюцца пры дапамозе супрацоўнікаў музея, якія забяспечваюць узаемадзеянне кодаў і іх адэкватную расшыфроўку – інтэрпрэтацыю – наведвальнікамі ў тым ліку і праз вербальную інтэрпрэтацыю – экскурсію.

Зразумела, што змадэляваная ў музеі рэчаіснасць не з'яўляецца поўным адпаведнікам рэальна існаваўшых з'яў, падзей, фактаў. Як правіла, пры адборы музейных прадметаў для размяшчэння ў экспазіцыі пад увагу бяруцца асобныя аспекты іх інфармацыйнага патэнцыялу адпаведна навуковай канцэпцыі. Пры розным спалучэнні тых ці іншых аспектаў як унутранага, так і знешняга інфармацыйнага поля прадметаў можна атрымаць розныя, часам супрацьлеглыя, мадэлі.

Экспазіцыя будуецца згодна навуковай канцэпцыі і архітэктурна-мастацкаму рашэнню, а значыць уяўляе сабой прасторавую мадэль рэчаіснасці. У філасофскім асэнсаванні гэта прасторава-часавая "мадэль-камера" [5], якая з'яўляецца спробай не толькі пазнання, але і зберажэння артэфактаў. Мінулае як час антрапалагічна можа быць прадстаўлена толькі ў выглядзе мадэлі, што ўяўляецца як "мадэль-камера" мінулага ў сучасным, замкнёная музейная прастора, заведама выдзеленая са звычайнай прасторы.

Любая гістарычная экспазіцыя ўяўляе сабой мадэль, якая ўзнаўляе наша бачанне таго ці іншага гістарычнага факта, з'явы, падзеі. У музеі бачанне гістарычнага працэсу мадэлюецца прасторава-часавай арганізацыяй экспазіцыі. Мадэль гістарычнай прасторы ўтвараюць экспанаты, у сваю чаргу катэгорыя "час" у прасторы музея набывае асобы змест. На асаблівасці музейнага прадстаўлення гістарычнага часу звяртае ўвагу расійскі гісторык і музеёлаг У. У. Кандрацьеў [6], які выдзяляе катэгорыю "музейнай час" у сувязі з абгрунтаваннем існавання катэгорыі "музейная прастора". Даследчык звязвае ўзнікненне музейнага часу, які з'яўляецца спецыфічным уяўленнем чалавека пра час, з часавымі зрушэннямі пры ўспрыманні экспазіцыі ці асобных прадметаў адрасатам музейнай інфармацыі. Ілюзорны музейны час, па меркаванні даследчыка, рэальна існуе ў апасродкаванай форме "музейнай прасторы", якая ў сваю чаргу характарызуецца некалькімі фактарамі, адзін з іх – прадметнасць. Музейную прастору складаюць музейныя прадметы, якія ўяўляюць сабой фрагменты "затрымаўшагася часу", а сама прастора ёсць увасоблены музейны час. З пункту погляду суб'екта музейны час і музейная прастора неаддзельныя адно ад



Рэпазіторый ВДУ

другога і зліваюцца ў адзінае цэлае, г. зн. без часу музейная прастора губляе сваю музейнасць і поўнасцю знікае, пераўтвараючыся ў фізічную размешчанасць. Самае галоўнае адрозненне "музейнай прасторы–часу" ад фізічнай – гэта тое, што яна з'яўляецца суб'ектыўным уяўленнем і не існуе па-за чалавечай свядомасцю.

На асаблівасці музейнага прадстаўлення гістарычнага часу звяртае ўвагу расійскі даследчык, кандыдат гістарычных навук У. Ю. Дукельскі [7]. Гістарычныя падзеі ўтвараюць тканіну экспазіцыйнага аповеду ў сваіх прасторава-часавых сувязях. Паслядоўнасць тэм задаюць накіраванасць часу і вызначаюць сістэму яго вымярэння. Часавыя прамежкі выдзяляюцца асобым чляненнем экспазіцыйнай прасторы, што робіць музейны час дыскрэтным. Галоўная роля ва ўзнаўленні часавых адносін належыць музейнаму прадмету, які здольны рэпрэзентаваць не проста падзею ці асобу, а цэлую эпоху, чым і тлумачыцца часавая ёмістасць музейнай экспазіцыі.

Такім чынам, *музейная экспазіцыя* – гэта заведама выдзеленая са звычайнай прасторы разгорнутая прасторава-часавая мадэль, створаная на аснове інтэпрэтацыі аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны, якія ўтвараюць прадметна-прасторавую структуру і вызначаюць часавую арганізацыю экспазіцыі, з мэтай рэканструявання гістарычнай рэчаіснасці ў музейнай прасторы. Іншымі словамі, экспазіцыя музея ўяўляе сабой інтэрпрэтацыйную мадэль гістарычнай рэчаіснасці.

Важнае значэнне ў працэсе музейнага мадэлявання мае апошні яго ўзровень – камунікацыйны, на якім адбываецца ўспрыняцце наведвальнікам прэзентаванай музеем мадэлі рэчаіснасці і генерыраванне ўласнай мадэлі ў залежнасці ад шэрага аб'ектыўных і суб'ектыўных фактараў. Асаблівасцю музейнай формы перадачы інфармацыі з'яўляецца тое, што праз канкрэтныя экспанаты наведвальніку перадаюцца не толькі факты, але меркаванні, уяўленні і адносіны да іх і тым самым аказваецца ўплыў на фарміраванне светапогляду і свядомасці наведвальніка.

Камунікацыйны аспект прадугледжвае суаднясенне кодаў адрасантаў паведамлення (музейных супрацоўнікаў) у форме экспазіцыі з кодамі адрасатаў (наведвальнікаў). Недастатковы фонд папярэдніх ведаў і фонд знакаў наведвальніка, г. зн. таго, што складае яго інфармацыйны тэзаўрус, становіцца крыніцай семантычных перашкод на шляху праходжання інфармацыі, што можа прывесці да частковага ці поўнага неразумення ці непрыняцця прапанаванай музеем мадэлі гістарычнай рэчаіснасці.

**Заключэнне.** У метадалагічным арсенале музеялогіі прысутнічаюць разнастайныя метады пазнання, сярод якіх – інтэрпрэтацыя, якая ў дыскурсе гэтай навукі разглядаецца як вытлумачэнне аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны ў кантэксце музейнага збору і музейнай экспазіцыі. Камбінаванне формаў і зместаў – музейных прадметаў – утварае музейную экспазіцыю, якая не можа з'яўляцца поўным адпаведнікам гістарычных фактаў, з'яў і падзей, бо мінулае існуе толькі ў свядомасці чалавека, але выступае ў якасці іх замяшчальніка. Мадэль, якую ўяўляе сабой экспазіцыя, служыць для канструявання гістарычнай рэчаіснасці і яе пазнання, галоўным мадэлюючым механізмам чаго з'яўляецца працэс інтэрпрэтацыі музейных прадметаў.

Вынікі праведзенага даследавання могуць быць выкарыстаны пры вызначэнні мадэлей гістарычнай рэальнасці, характэрных для музеяў гістарычнага профілю Беларусі, значную частку якіх складаюць краязнаўчыя музеі. Менавіта краязнаўчыя музеі, якія вызначаюць катэгорыю рэгіянальных музеяў рэспублікі, маюць неаспрэчны ўплыў на фарміраванне рэгіянальнай і нацыянальнай ідэнтычнасці грамадства. Выбар найбольш эфектыўных мадэлей і стварэнне на іх аснове новых з'яўляецца падмуркам устанаўлення трывалай камунікацыі паміж музеем і наведвальнікам.

## ЛІТАРАТУРА


1. Кряжевских, М. Ю. Модель коммуникационного пространства музея / М. Ю. Кряжевских // Вестн. Челябин. гос. ун-та. – 2012. – № 4 (258). – Философия. Социология. Культурология. – Вып. 3. – С. 65, 67.
2. Модель // Философский энциклопедический словарь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://dic.academic.ru/dic.nsf/enc_philosophy/4535. – Дата доступа: 19.04.2019.
3. Музееведение. Музеи исторического профиля: учеб. пособие для вузов по спец. «История» / под ред. К. Г. Левыкина, В. Хербста. – М.: Высш. шк., 1988. – С. 122.
4. Бетти, Э. Герменевтика как общая методология наук о духе / Э. Бетти; пер. с нем. Е. В. Борисов. – М.: «Канон+» РООИ «Реабилитация», 2011. – С. 90.
5. Философия музея: учеб. пособие / под ред. М. Б. Пиотровского. – М.: ИНФРА-М, 2015. – С. 39. – (Высшее образование: Магистратура).
6. Дукельский, В. Ю. В поисках музейной концепции истории / В. Ю. Дукельский // Музейная экспозиция: Теория и практика. Искусство экспозиции. Новые сценарии и концепции: сб. науч. ст. / Рос. акад. наук, Рос. ин-т культурологии; редкол.: М. Т. Майстровская (отв. ред.) [и др.]. – М., 1997. – С. 33–41.
7. Кондратьев, В. В. Музейная игра / В. В. Кондратьев // Музей и демократия: сб. ст. / Лаборатория музейного проектирования, Российский ин-т культурологии; редкол.: Н. А. Никишин (отв. ред.) [и др.]. – М., 1997. – С. 72–79.


*Паступіў у рэдакцыю 13.05.2019 г.*

Рэпазіторый БДТУ